**23.** Словазлучэнне ***пяшчотнае слова*** паводле сэнсавай ролі залежнага слова называецца… .

**А)** аб'ектным. **Б)** азначальным. **В)** акалічнасным.
**Г)** складаным. **Д)** прыслоўным.

**24.** Якім членам сказа з'яўляюцца выдзеленыя словы ў сказе:

***Шэсць вучняў** атрымалі ўзнагароды за ўдзел у мерапрыемствах?*

**А)** акалічнасцю і дзейнікам. **Б)** дзейнікам. **В)** дапаўненнем.
**Г)** акалічнасцю і дапаўненнем. **Д)** азначэннем.

**25.** Выберыце з прыведзеных словы, якія пішуцца праз злучок: *1) усходне..славянскі; 2) паў..года; 3) цёмна..сіні; 4) паўна..водны; 5) перакаці..поле.*

**А)** усе словы. **Б)** 1, 3, 4. **В)** 2, 4, 5. **Г)** 3, 5. **Д)** 4, 5.

**26.** Як называецца літара ***ш***?

**А)** ша. **Б)** шэ. **В)** шу. **Г)** шы. **Д)** шо.

**27.** Пра якія творы гаворыцца ў выказванні В. Чамярыцкага: *«Як помнікі пісьменства гэтыя творы спалучаюць асаблівасці гістарычных дакументаў, неацэннай крыніцы пазнання далёкага мінулага нашага народа, і твораў свецкай апавядальнай прозы, гістарычнай белетрыстыкі»*. Выберыце правільныя варыянты з прыведзеных прыкладаў: *1) апавяданні; 2) міфы; 3) летапісы; 4) легенды; 5) хронікі.*

**А)** 1, 4. **Б)** 2, 4. **В)** 2, 3. **Г)** 3, 5. **Д)** 4, 5.

**28.** Дадзены суфіксы: *1) -ір-; 2) -ін-; 3) -ёр-; 4) -еец-; 5) -ейск-; 6) -ік-*. Перад якімі суфіксамі з прыведзеных у словах іншамоўнага паходжання замест ***д***, ***т*** пішацца ***дз***, ***ц***?

**А)** перад усімі суфіксамі. **Б)** 1, 2, 4. **В)** 1, 3, 5. **Г)** 2, 4, 6. **Д)** 3, 4, 5.

**29.** Колькі літар ***е*** не хапае ў прыведзеных прыказках і прымаўках?

*Н..ма смачней вадзіцы, як з роднай крыніцы.*
*Дрэнныя тыя рукі, што н.. ведаюць н..якай навукі.*
*Хто арэ і се.., той малоціць і ве..*
*Н..знайка дарогі н.. пакажа.*
*Хто н.. ідзе, той н.. спатыка..цца.*

**А)** 3. **Б)** 5. **В)** 7. **Г)** 8. **Д)** 10.

**30.** Хто з беларускіх мастакоў слова назваў прыказкі і прымаўкі «***крынічным звонам бессмяротнасці роднае мовы***»?

**А)** Янка Купала. **Б)** Уладзімір Караткевіч. **В)** Янка Брыль.
**Г)** Уладзімір Дубоўка. **Д)** Максім Танк.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб'яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3–218; тэл. (017) 292 80 31, 292 34 01, 290 01 53;
e-mail: info@bakonkurs.by; http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 11. Тыраж 24500 экз. г. Мінск. 2009 г.

Конкурс па беларускай мове
**«БУСЛІК-2009»**

*Чацвер, 19 лютага 2009 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку.

## Заданне для вучняў 7-8 класаў

**1.** Колькі разоў паўтараецца гук [у] у словах вершаваных радкоў Васіля Жуковіча?

*Лілечка*
*лялечку Алачку*
*любіць, яе забаўляе.*

*Лілечка*
*лялечку Алачку*
*ў люльцы люляе.*

**А)** 3. **Б)** 4. **В)** 6. **Г)** 7. **Д)** 9.

**2.** Выберыце з прыведзеных літар толькі тыя, пасля якіх у беларускай мове не пішацца мяккі знак: *1) б; 2) л; 3) в; 4) м; 5) ц; 6) ф; 7) з.*

**А)** усе літары. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** 1, 3, 4, 6. **Г)** 2, 3, 5, 7. **Д)** 3, 4, 5.

**3.** У якіх словах з прыведзеных замест пропуску патрэбна напісаць літару ***е***?

*1) ч..рапаха; 2) ж..луд; 3) л..снік;*
*4) с..нтэтыка; 5) кал..ктыў; 6) н..кепскі; 7) цец..рукі.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** 1, 3, 7. **В)** 2, 4, 5. **Г)** 3, 6. **Д)** 5, 7.

**4.** Мы гаворым: *«Хлопчык чытаў, дзяўчынка чытала»*. А як правільна ўжыць дзеяслоў ***чытаць*** у форме прошлага часу, гаворачы пра ***дзіця***?

**А)** чытаў. **Б)** чытала. **В)** чытало. **Г)** чытав. **Д)** чытал.

**5.** Дадзены назоўнікі: *1) дзядзьку; 2) Віці; 3) Кузьму; 4) імю; 5) гусю.* У якіх словах правільна запісаны канчаткі ў форме давальнага склону?

**А)** 1, 3, 5. **Б)** 1, 4. **В)** 2, 3, 5. **Г)** 3, 4, 5. **Д)** ва ўсіх прыкладах.

**6.** Выберыце з прапанаваных прыклады, у якіх усе словы сінанімічныя:
*1) здагадка, думка, меркаванне;* *2) здарэнне, выпадак, падзея;*
*3) жыллё, прыстанішча, кватэра.*
**А)** усе прыклады. **Б)** 1, 2. **В)** 1. **Г)** 2, 3. **Д)** 3.

**7.** Янка сказаў сваім сябрам, што яго брат-студэнт добра вывучыў сваю справу на практыцы і таму цяпер будзе называцца … Выберыце правільны варыянт.
**А)** лабарант. **Б)** практыкант. **В)** практык.
**Г)** прыёмшчык. **Д)** ганарлівец.

**8.** Выберыце «лішняе» слова з прапанаваных: *1) ваўчаня; 2) медзведзяня; 3) арляня; 4) зубраня; 5) зайчаня.*
**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**9.** Колькі стыляў вылучаецца ў сучаснай беларускай мове ў адпаведнасці са сферамі грамадскай дзейнасці?
**А)** 3. **Б)** 5. **В)** 7. **Г)** 8. **Д)** 10.

**10.** Якое слова-адгадку неабходна дапісаць у вершаваную загадку С. М. Шах?
*У баравых мясцінах нізкіх, –* *густы ды мяккі мох такі,*
*дзесь, можа, дальніх, можа, блізкіх, –* *што вырастуць … .*
**А)** апенькі. **Б)** махавікі. **В)** лісічкі. **Г)** маслякі. **Д)** грузды.

**11.** ***Драматычная паэма*** – жанравы тып паэмы, які ўзнік на сумежжы паэмы і... .
**А)** прозы. **Б)** драмы. **В)** балады. **Г)** легенды. **Д)** міфа.

**12.** Вызначце правільна напісаны лічэбнік: *1) абедзьвюх; 2) абедзвюх; 3) абедзвух; 4) абедзьвух.*
**А)** няма правільнага варыянта. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**13.** ***Дзеепрыметнік*** – форма … .
**А)** прыметніка. **Б)** прыслоўя. **В)** дзеяслова.
**Г)** лічэбніка. **Д)** займенніка.

**14.** У якіх словах з прапанаваных патрэбна ўставіць замест кропак літару ***а***?
*1) матацык..л; 2) скульпт..р; 3) с..крэт; 4) р..корд;*
*5) морк..ва; 6) шч..бятаць; 7) др..жанне.*
**А)** 1, 2, 4. **Б)** 2, 3, 6. **В)** 3, 4, 7. **Г)** 4, 6, 7. **Д)** ва ўсіх словах.

**15.** Сымонка прачытаў запісаны сябрам сказ і сказаў, што той прапусціў знак прыпынку: *«Надвор'е на возеры часта мяняецца, – расказваў унукам дзядуля – Гэтак жа часта змяняе свой колер і возера».* Які знак прыпынку прапушчаны?
**А)** коска. **Б)** кропка. **В)** двукроп'е. **Г)** пытальны знак. **Д)** двукоссе.

**16.** Колькі дзеяслоўных словазлучэнняў можна вызначыць у вершаваных радках М. Аўрамчыка:
*Павольна спее навальніца* *Буйнымі гронкамі зарніцаў*
*Сярод засмяглай цішыні…* *Змрок набухае ў вышыні?*
**А)** 2. **Б)** 4. **В)** 6. **Г)** 8. **Д)** 10.

**17.** Знайдзіце схаваныя ў рэбусах назвы птушак:

1) 


2) 


3) 


4) 


5) 


**А)** няма такіх назваў. **Б)** 1, 4. **В)** 2, 3. **Г)** 3, 4. **Д)** 3, 5.

**18.** Перастаўце прапанаваныя сказы так, каб атрымаўся тэкст:
*1) Неўзабаве яны зрабіліся больш гучнымі і працяглымі.*
*2) Лісце зашамацела.*
*3) Пачуліся глухія раскаты грому.*
*4) На зямлю пачалі капаць рэдкія кроплі дажджу.*
*5) Нечакана наляцеў вецер.*
*6) Цёмнае неба прарэзала маланка.*
*7) Сонца схавалася.*
*8) Неба завалаклі цяжкія хмары.*
**А)** 2, 1, 5, 7, 6, 8, 3, 4. **Б)** 2, 8, 3, 4, 1, 6, 7, 5. **В)** 4, 1, 5, 8, 3, 2, 7, 6.
**Г)** 5, 6, 2, 1, 8, 7, 4, 3. **Д)** 5, 8, 7, 2, 3, 1, 6, 4.

**19.** Выберыце з прыведзеных словы, у якіх ёсць марфалагічнае падваенне зычных: *1) карэнны; 2) багацце; 3) Жанна; 4) каменны; 5) жыццё.*
**А)** усе словы. **Б)** 1, 4. **В)** 2, 3, 5. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**20.** Вядомы беларускі пісьменнік Кузьма Чорны сказаў: *«Чалавек – гэта цэлы …».* Якое слова прапушчана?
**А)** клад. **Б)** сусвет. **В)** цуд. **Г)** абсяг. **Д)** крышталь.

**21.** Якое значэнне мае запазычаны фразеалагічны выраз *залатая сярэдзіна*?
**А)** заблытаная справа. **Б)** рызыкаваць чым-небудзь.
**В)** без разбору, без асабістай пазіцыі.
**Г)** падыход з улікам розных меркаванняў. **Д)** нікому не даючы перавагі.

**22.** Выберыце з прапанаваных назоўнікі, якія маюць форму толькі адзіночнага ліку: *1) захад; 2) калосссе; 3) блакіт; 4) Нарач; 5) рэалізм; 6) капуста.*
**А)** усе назоўнікі. **Б)** 1, 5, 6. **В)** 1, 2, 4. **Г)** 2, 3, 4, 5. **Д)** 3, 6.